

Ты прыгажэй кутка не знойдзеш.
Гранічы – мой родны край!
То тут, то там лясок сінее,
у лагчынах рэчачкі блішчаць.
Куды ні глянь – спакоем вее,
Канца прастору не відаць.

А хмарка ў небе, у ясным полі
Плыве шчасліва, як дзіця,
І забываеш мімаволі
Увесь клопат буйнага жыцця.

Куды ні гляне маё вока, –
Усё поўна згоды, дабраты,
Ты маеш выгляды прарока,
Гранічы, мой край святы!

*Хадасевіч Анастасія,*
*выпускніца Граніцкага*
*дзіцячага сада-базавай школы*



***Наведайце куткі роднага краю,***
***палюбуйцеся непаўторнасцю***
***прыгажосці прыроды***
***сваёй малой радзімы!***

**Наш аграгарадок Гранічы – гэта часцінка вялікай і выдатнай краіны. Клопат аб родным краі – гэта клопат аб Радзіме. Няхай у нашых лугах квітнеюць кветкі, у лясах пышна растуць дрэвы, спакойна спяваюць птушкі. Няхай ў крыніцах і студнях вада будзе чыстая і празрыстая, няхай у рэках і азёрах будзе шмат рыбы. Усё гэта – наша багацце. Любіць сваю прыроду – гэта значыць, берагчы яе, клапаціцца аб ёй, сябраваць з ёю!**

Дамашнее заданне

**ДУА “Граніцкі навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа Маладзечанскага раёна”**

# Родны луг чаруе прыгажосцю



# Пешы маршрут выхаднога дня

# Жывёльны свет луга

Выглядаюць жыхары
Кожны са сваёй нары.
Чорным футрам бліснуў кроцік,
Сонцу паказаў жывоцік.
Прамільгнулі каля сценкі
Мышак шэрыя сукенкі.
Выцінае нізкі гук
У палёце чорны жук.
Мабыць, у цёплую пару
Я сабе зраблю нару.
*Любоў Сівурава*

Кароўка-багоўка-
Маленькі жучок.
Чорная галоўка.
З плямкамі бачок.
Па далоньцы ножкамі
Не паўзі на край!
Будзь маёю брошкаю
Ды не адлятай!
*Валянцін Кодран*



**На тэрыторыі аграгарадка Гранічы знаходзіцца луг, які славіцца сваім раслінным і жывёльным светам, сваёй прыгажосцю.**

**На лузе расце шмат разнастайных траў і кветак**



**Як брыльянты, рассявае
Ночка летняя расіцу.
Туманамі спавівае
Луг зялёны над крыніцай.**

**А як раніца настане,
Бліскі сонца загуляюць,
Рос прыходзіць адцвітанне,
Туманы ў рэчцы таюць.**

**Як брыльянты, гінуць росы
На зялёнай сенажаці;
Сонца косы, нашы косы
Не даюць паўдня ім знаці!**
***Я.Купала***

**Загадкі**

# Раслінны свет луга

**Расцвілі на лузе кветкі.
Колькі іх – глядзіце, дзеткі:
Лён, гваздзікі, васілёчкі –
Можна звіць іх у вяночкі.
Вось рамонкі, вось званочкі,
Канюшына і ірысы…
Як чаруюць іх абрысы.**



**Літаратурныя творы пра луг**